В.Р.Дакучыц
(Мінск, Рэспубліка Беларусь)

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ

Поспех у навучанні ў многім залежыць ад умення правільна арганізаваць самастойную работу. Шматгадовы вопыт працы з вучнымі педагагічных класаў, слухачамі падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў паказаў, што не ўсе з іх могуць правільна арганізаваць самастойную работу.

Арганізацыя самастойнай работы прадугледжвае выкарыстанне яе як крыніцы самастойнага набыцця ведаў. Яна садзейнічае замацаванню, канкрэтызацыі і праверцы засваення ведаў.

Адным з накирункаў работы выкладчыкаў факультэта даінстытуцкай падрыхтоўкі и прафесійнай арыентацыі моладзі з'яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў уменняў і навыкаў самастойнай работы. Для гэтага неабходна:

1. Выхаваць патрэбнасць навучэнцаў у самастойнай рабоце.
2. Аказаць дапамогу ў ацэнцы іх здольнасцей.
3. Вызначыць напрамкі самастойнай работы.
4. Навучыць складаць яе план і працаваць па ім; кантраляваць сябе, ацэньваць вынікі сваёй працы і абгрунтоўваць іх.
5. Зрабіць самападрыхтоўку сістэмнай і рэгулярнай.

Каб актывізаваць самастойную падрыхтоўку навучэнцаў, рэалізаваць вышэй пералічанные задачы, трэба перад пачаткам заняткаў азнаёміць іх з тэматыкай самастойна вывучаемых тэм і тэрмінам іх вывучэння. Так, напрыклад, у курсе "Беларуская мова" для самастойнага вывучэння можна прапанаваць наступныя тэмы: "Дыялектныя словы", "Спецыяльныя і прафесійныя словы", "Выклічнік", "Ускосная мова" і г. д. Слухачы падрыхтоўчага аддзялення зараней ведаюць аб'ём самастойнай працы, таму могуць правільна размеркаваць свой час. Мэтазгодна складаць індывідуальныя планы самападрыхтоўкі, абмяркоўваць іх у групе і карэкціраваць з дапамогай выкладчыка. Ёсць рацыя ў правядзенні групавых справаздач па выкананні планаў, іх калектыўным абмеркаванні. Гэта прывучыць навучэнцаў крытычна ацэньваць свае і чужыя вынікі працы, больш сур'ёзна адносіцца да самападрыхтоўкі і рабіць глыбокія, абгрунтаваныя вывады. У працэсе самападрыхтоўкі слухачы вучацца карыстацца бібліятэкай, каталогамі, даведнікамі, складаць тэзісы, пісаць канспекты, рэфераты, ствараць картатэку.

Навыкі самастойнай работы, выпрацаваныя и замацаваныя пры вывучэнні тых ці іншых прадметаў, прадугледжваюць не толькі высокі ўзровень ведаў, творчыя адносіны да вучобы, але і аказваюць дапамогу ў фарміраванні асобы:

– з'яўляюцца ўмовай самавыхавання і аб'ектыўных адносін да сябе;

– фарміруюць адэкватную самаацэнку, патрабавальнасць самакрытычнасць, дысцыплінаванасць, а таксама прафесійныя якасці асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ